# На тым тыдні...

✓**11 лютага** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры ў рамках часовай літаратурна-дакументальнай экспазіцыі «Валянцін Тарас і Рыгор Барадулін. На выспе ўспамінаў...», прымеркаванай да 90-годдзя В. Тараса і 85-годдзя Р. Барадуліна прайшоў **Вечар памяці паэта, празаіка, публіцыста, перакладчыка Валянціна Тараса**. Экспазіцыя складаецца з частак, прысвечаных канкрэтным перыядам у жыцці пісьменнікаў. Прадстаўленыя матэрыялы з фондаў музея гісторыі беларускай літаратуры і архіва сям'і Тарасаў: арыгінальныя фотаздымкі, рукапісы, асабістыя рэчы, творы пісьменнікаў, часопісы, кнігі з дароўнымі надпісамі. Пад час імпрэзы прагучалі ўспаміны сяброў, калегаў, родных.

✓**12 лютага** ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага прайшло **адкрыццё персанальнай выстаўкі жывапісу Раісы Сіплевіч «PATSINKA»**, прымеркаванай да 70-годдзя мастачкі. Назва выстаўкі – гэта творчы псеўданім, пад якім працуе мастачка Р. Сіплевіч. У экспазіцыі больш за 80 жывапісных прац з 1990-х гг. да нашых дзён. Адзін з любімых яе вобразаў – птушка. Крылатыя вольныя птахі суправаджаюць яе гераінь; узняцца над рэальнасцю, узяўшы толькі найлепшае і гіпербалізаваць гэтае лепшае – вось сапраўдная здольнасць Р. Сіплевіч.

Пабачыць творы можна да 8 сакавіка.

✓**12 лютага** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адбылася **творчая сустрэча «Не грусти»** з паэтам Фёдарам Баравым. Гучалі вершы пісьменніка, выступілі ўдзельнікі тэатра песні і паэзіі «Разам», які стварыў Ф. Баравы, а таксама скульптар Іван Міско, пісьменнікі Міхась Пазнякоў і Валерый Калінічэнка, салістка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Алена Сало ды інш.

✓**13 лютага** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь сумесна з Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатрам оперы і балета Рэспублікі Беларусь урачыста адкрытая **выстаўка**, прысвечаная творчым дасягненням мастака-пастаноўшчыка **Кацярыны Булгакавай «...Ад ідэі да тэатральнай сцэны...»**

У тэатр оперы і балета К. Булгакава прыйшла як мастак-пастаноўшчык у 2002 г. і працуе дагэтуль, брала ўдзел у афармленні больш за 20 спектакляў.

✓**13 лютага** Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў запрасіў на **выстаўку «Сэрца назіральніка за птушкамі»**. Штуршком стала кніга «Мроі пра паветра. Вопыт пра ўяўленне руху» французскага філосафа і мастацтвазнаўцы Гастона Башляра. Мара пра чалавечы палёт настолькі простая і недвухсэнсоўная, што часта ўспрымаецца на мяжы банальнасці. Узяўшы за аснову сімвалізм палёту, выстаўка паказвае нязменнае імкненне чалавека да ўзнёслага, яго адчайнае жаданне пераадолець штодзённасць, сцвярджае каштоўнасць летуценнасці і фантазіі і ў той жа час нагадвае пра крохкасць чалавечага. Большасць твораў – са збору Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў: працы Канстанціна Селіханава, Паўла Вайніцкага, Ганны Ціханавай-Ёрданавай і іншых.

Пабачыць працы можна па 8 сакавіка.

✓**13 лютага** ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча адбылася імпрэза **«Уладар кахання – Купідон»**, прымеркаваная да дня закаханых. У паэзіі Багдановіча не заўсёды зразумееш: жанчыны ў яго вершах – гэта ідэальны вобраз, мроя ці рэальны чалавек. Гісторыі кахання заўсёды былі няпростымі, гісторыі яго сям'і – не менш складаныя. На імпрэзе прапанавалі пазнаёміцца з імі бліжэй, даведацца пра жанчынаў, з якімі М. Багдановіча звязаў лёс, таямніцы асабістага жыцця паэта і яго сям'і. Працягнуў рамантычную ноту інды-фолк гурт «Няміга».

Музей беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах **15 лютага** запрасіў **на выстаўку «Чараўніцтва іголачкі»**. Прадстаўленыя працы выдатных майстрых Святланы Піваварчык і Святланы Аляксеевай. Абедзве звязаныя са стварэннем і дзейнасцю клуба «Сузор'е» пры Беларускім саюзе жанчынаў Першамайскага раёна г. Мінска. Вышывальшчыцы спалучаюць у сваіх працах складаныя матэматычныя вылічэнні кожнага сцяжка, дакладнасць строгай схемы з палётам фантазіі і ўласнымі эстэтычнымі перавагамі. Прадстаўленыя працы, выкананыя ў розных тэхніках ручной вышыўкі: лічыльны крыж, паўкрыж, габеленавы шоў, гладзь і іншыя – ад вышытых невялікіх сурвэтак да абрусаў, ад мініяцюрных сумачак да навалачак. Вышытыя карціны прыцягваюць асобную ўвагу.

Выстаўку можна пабачыць па **16 мая**.

✓У гатэлі «Crowne Plaza Minsk» **18 лютага** прайшла **канферэнцыя «Двусторонние отношения между Беларусью и Турцией в сфере культуры и образования»**, у рамках якой адбылося падпісанне Мемарандума аб супрацоўніцтве паміж Музеем анаталійскіх цывілізацыяў (г. Анкара, Турцыя) і Нацыянальным гістарычным музеем Рэспублікі Беларусь.

У рамках мерапрыемства абмеркаваныя пытанні супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Турцыяй. Удзел бралі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Турэцкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Мустафа Озджан, прадстаўнікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, установаў культуры і адукацыі, журналісты.

✓**18 лютага** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адбылося **адкрыццё выстаўкі станковай і кніжнай графікі «Я валяюсь на траве, сто фантазий в голове...»** Лоры Стрыжак і Наталлі Харольскай. Прысвечаная выстаўка тэме дзяцінства, вобразам дзяцей, свету іх фантазіяў, мрояў і памкненняў.



*Пад час Вечара памяці Валянціна Тараса*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ